*І. М. Гоўзіч*

# МАТЫЎ «ВІДУШЧЫЯ — НЕВІДУШЧЫЯ» І ЯГО МАСТАЦКАЯ РЭАЛІЗАЦЫЯ Ў ТВОРЧАСЦІ ЯНКІ КУПАЛЫ І ПРАДСТАЎНІКОЎ ФІЛАЛАГІЧНАГА ПАКАЛЕННЯ

Праблема «відушчасць — невідушчасць» з разраду агульначалавечых, вечных. Яе значнасць абумоўлена заўсёдным жаданнем чалавецтва глыбей спазнаць сябе ў атачэнні прыроды як свядомую часцінку Сусвету. Паступова ўзнімаючыся ад няведання з'яў да іх адноснага разумення, людзі рухаліся да сучаснай ступені цывілізацыі — навуковай, культурнай, літаратурна-эстэтычнай. Залежны ад року, «пясчынка ў сусвеце» (формула Ламаносава і паэтаў-радзішчаўцаў), чалавек паступова ператвараўся ў «рэгуліроўшчыка каруселі» жыцця (А. Куляшоў). Падобны працэс і занатавала літаратура народаў свету. І найперш — праз раскрыццё праблемы, вынесенай намі ў назву артыкула.

Паколькі праблема «відушчасць — невідушчасць» метадалагічна важная, дамінантная і датычыцца лёсу чалавецтва ў цэлым, яго прагрэсу, ёю не маглі не цікавіцца аўтары старадаўніх манускрыптаў, стваральнікі фальклорных твораў. Яна вандравала па многіх тварэннях мастацтва, пачынаючы з міфаў, з Кнігі кніг «Бібліі», старадаўніх «Іліяды», «Адысеі», «Калевалы».

У трагедыі Эсхіла «Прыкуты Праметэй» знаходзім радкі пра пакаранне Зеўсам тытана шляхам пазбаўлення яго святла, пакарання цемрай. Цар Эдып з аднайменнай трагедыі Сафокла сам сябе асляпіў, каб не бачыць сонца, сваіх дзяцей, якім прынёс толькі пакуты, не бачыць сябе самога і не радавацца жыццю, бо не ўсё на самой справе з'яўляецца такім, якім мы яго бачым.

Амаль пра тое ж самае сведчыць і змест Бібліі, вузлавыя сэнсавыя моманты Кнігі кніг. Адна з першых спроб распрацоўкі праблемы была зроблена яшчэ ў пачатку Нашага часу ў «Новым запавеце»: Хрыстос — сын Бога — усё бачыць і ўсё чуе, а астатнія — сляпыя, «невідушчыя», не разумеюць сапраўднай сутнасці рэчаў, а з'яўляюцца адно толькі раўнадушнымі (у большасці сваёй) сведкамі ўкрыжавання Прарока на Галгофе. Апосталы ж па сваёй сутнасці хутчэй за ўсё не разумеюць да канца свайго шляху як неад'емнага ад шляху Хрыста. Біблія трактуе, што розум адыгрывае ці не апошнюю ролю ў самапазнанні і самаразуменні ў падобным кірунку. Галоўнае ж тут — Вера ў правільнасць выбару і бездакорнасць пазіцыі Хрыста як носьбіта ідэй святла, бачання: «И сказал Иисус: на суд пришёл я в мир сей, чтобы невидяшие увидели, а видящие стали слепы» (Ев. ад Іаана. 9, 39).

Падобныя ж матывы мы знаходзім не толькі ў хрысціянскім вучэнні, але і ў старадаўніх паганскіх вераваннях нашых продкаў: заўсёды, у любы час знаходзіліся прарокі, якія вялі за сабой народ, бачылі свет па-свойму і таму імкнуліся выкарыстаць іншых («невідушчых») у сваіх мэтах (іх называлі ўладарамі, вешчунамі, старэйшынамі). У агульным філасофскім плане «відушчасць» — Святло, Бог, Дабро, а «невідушчасць» — Цемра, Д'ябал, Ліха. Гістарычна і дыялектычна гэтая праблема залежыць ад супрацьстаяння Неба, Вышыні і Зямлі, Нізу. А раўнавагу паміж гэтымі супрацьлеглымі полюсамі знайсці вельмі цяжка. Яна, гэтая раўнавага, залежыць ад таго, ці можа кожны чалавек выбіраць свой лёс, свой шлях, які прывядзе туды, куды марыць патрапіць, на першы погляд, і ён сам і многія іншыя. «Відушчасць» у агульным плане — гэта імкненне да дабра і святла, да разумення «сапраўднасці» абранага шляху і ў той жа час адказнасці за «невідушчых», якія могуць пайсці за табой; «невідушчасць» — цемра, цяжкі, пакутны сон, якога павінен пазбавіцца чалавек, каб пачаць жыццё па больш-менш прыстойных правілах.

У беларускай літаратуры распрацоўка гэтай праблемы была закладзена Ф. Багушэвічам, большасць твораў якога складае пласт грамадзянскай лірыкі з выхадам на агульны роздум пра рэальныя магчымасці пракокаў і ўладароў гэтага свету: спіць мужык-беларус, не бачыць ці знарок не хоча заўважаць здзекаў, што загналі яго ў труну, але ён не мёртвы, ён можа прачнуцца, абудзіцца, калі сам, адкрыўшы вочы, зразумее абсурднасць падобнага становішча. У творчасці выдатнага паэта адбываецца пераацэнка каштоўнасцей, з агульнафіласофскай плоскасці пытанне пераводзіцца ў чыста практычную і сацыяльную. Прыпамінаецца з гэтай нагоды і знакамітае выслоўе Ф. Ніцшэ з кнігі «Так казаў Заратустра»: «Бог памёр», а таму Дабро і Зло памяняліся сваімі месцамі, страцілася мяжа паміж імі. «Відушчыя» сталі ў Ф. Багушэвіча ілжэпрарокамі, носьбітамі Цемры і Пустэчы, а сапраўдны прарок яшчэ не прыйшоў, паэт толькі рыхтуе людзей да ўспрымання яго з'яўлення.

Паспяхова працягнуў раскрыццё і прапанаваў сваё вырашэнне адзначанай праблемы ў беларускай літаратуры Янка Купала. Паняцце «невідушчасці» атаясамліваецца ў яго пафаснай грамадзянскай лірыцы з вобразам беларусаў — цёмных, сляпых, глухіх, забітых і загнаных. Заканамерна звязаны з такім падыходам вобраз слепаты выразна выяўляецца ў паэта, набывае мастацкі сінонім — вобраз сну. Спіць родная старонка, спіць народ беларускі, бо звялі яго да такога непрывабнага, жахлівага стану ўладары-ілжэпрарокі, пачвары ў людскім абліччы. Сон — прычына «невідушчасці», часовы (спадзяваўся паэт) стан беларускай су-

польнасці. Два паэтавыя вершы нават і назвамі сваімі адпавядаюць выказанаму намі асноўнаму тэзісу — «А ты, браце, спі!» і «Што ты спіш?» Працытуем для большай доказнасці ўрыўкі з іх:

Спі, а можа хто заблудзе
У твой бедны край
І цябе з душой разбудзе, —
Крыкне: «Уставай!»[1]

Толькі ты, брат, адзін,
Як забіты ляжыш,
І на долю сваю
Не ўстаеш, не глядзіш[2].

Жыццё на Беларусі ў пачатку XX ст., на погляд паэта, ідзе, «заціхшы, як сон у магіле», і таму для раскрыцця сваёй думкі пра не толькі шкоднасць, але і марнасць, дзікунства падобнага стану нацыі Янка Купала ставіць побач з назоўнікам «сон» прыметнікі, што выконваюць ролю ацэначных, эмацыянальна-страсных эпітэтаў: «аслепны», «марны», «ланцужны». Аднак паэт шукае выйсце з трагедыйнай сітуацыі і як сапраўдны мастак-грамадзянін знаходзіць паратунак у роднай мове, матчынай песні, навуцы, якія выведуць «невідушчых» на святло з цемры, раскрыюць ім вочы на сапраўдную (адносна, вядома) ісціну і дапамогуць актыўна супрацьстаяць захопнікам і знішчальнікам духоўных, чалавечых каштоўнасцей беларусаў, якія ператвараюць іх у чужынцаў на роднай зямлі: «Ўсе людзі значэнне пазналі вучэння, // Адзін толькі ты ані дбаеш!» («Груган», «Беларускія сыны» і іншыя творы 1918—1920 гг.).

Для Янкі Купалы матыў узыходу сонца перакрыжоўваецца з матывам абуджэння прыроды, чалавека, беларусаў ад сну, з матывам адраджэння, абнаўлення, набыцця людзьмі новага зроку, бо сонца ўвасабляе пры ўсім гэтым родную мову, якая чорны павой здымае з вачэй. Так нараджаюцца ў паэта гімны сонцу і мове («Песня сонцу», «Роднае слова»). Вясной, калі абагрэе сонейка зямлю і абудзіцца прырода, народ павінен прачнуцца. Але штовесну такія надзеі не спраўджваюцца. Вялікдзень набывае ў нашага паэта новае значэнне: гэтае свята — своеасаблівы рубеж, пасля якога, так хочацца верыць, многае адродзіцца да новага жыцця. Вось так нечакана ў Янкі Купалы тэзіс пра ўваскрашэнне Хрыста ператвараецца ў тэзіс пра адраджэнне і ўваскрашэнне Беларусі. У такі час духоўнага катарсісу лірычнаму герою здаецца, што ўжо днее, што праходзіць асляпенне і, нарэшце, цэлая нацыя выходзіць з цемры да святла:

Хрыстос васкрос!.. К табе, о Божа,
І ў дзень гэты просьбу шлю:
Хай Беларусь, мая старонка,
Ўваскрэсне к вольнаму жыццю![3]

Вобраз «відушчасці» у Янкі Купалы мае «шматланцуговы» характар: каб людзі сталі «відушчымі», ім патрэбныя ў адначассе Прарок, Пясняр, Ваяка, Уладар. Першы ўсё бачыць і пры дапамозе другога апавядае пра гэта, трэці, узгадаваны і падрыхтаваны папярэднімі, змагаецца за прыйсце сапраўднага Уладара, які зможа павесці за сабой нацыю, будзе турбавацца і клапаціцца пра яе самачыннасць і годнасць, адкрые вочы «невідушчым» («На Куццю»). Падобныя думкі не пакідаюць паэта нават у савецкія гады, калі ён не толькі бачыў з'яўленне новых ілжэпракаў і правадыроў («Прамова на 15-годдзі літаратурнай працы»), але папярэджваў пра тое, што яны маюць вострае жаданне зноў асляпіць беларусаў пустымі абяцанкамі: «На беларускай зямлі было і цяпер шмат ёсць фальшывых прарокаў, шмат рэнегацкіх душ, што за лыжку поснай паліўкі з чужой міскі запрадаюць сябе і свой народ у рабства чужынцам, але гэтага няма чаго баяцца. У адным з псалмаў біблейскіх сказана: «стануў Бог у зграмаджэнні Багоў і паміж Багамі суды судзіць». Будзем верыць, што і ў нас, беларусаў, прыйдуць новыя людзі, новыя прарокі і будуць па-божаму над фальшывымі прарокамі і прадажнымі душамі суды судзіць, з пакалення ў пакаленне пракляццямі ўспамінаць»[4].

Такім чынам, у Янкі Купалы «відушчы», Прарок, — гэта грамадзянін, грамадскі чалавек, стратэг, які часта прадбачыць трагедыйную сітуацыю і даводзіць пачатую справу да канца, хоць сляпыя, як краты, суродзічы часта і не бачаць і не чуюць яго. Таму паэт выходзіць не толькі на сацыяльны план, але і на план нацыянальны, агульначалавечы, філасофскі ў раскрыцці праблемы «відушчасці — невідушчасці», якую ён і ўвасобіў у сваіх вершах, паказаў трагедыю народа, што сам сябе не бачыць і не чуе, згубіў святло і волю і прабіваецца да іх праз завею («Паязджане»).

Янка Сіпакоў таксама ўнёс значны ўклад у распрацоўку акрэсленай вышэй праблемы. Ён перанёс разгляд гэтага пытання са сферы сацыяльна-палітычнай у сферу маральна-філасофскую. біблейскую. Чаму адны людзі бачаць («відушчыя»), а другія не бачаць ці не хочуць зразумець схаваную ад павярхоўнага зроку сутнасць спраў («невідушчыя»)? Аказваецца, усё даволі проста: мала хто можа адкрыта супрацьстаяць, як, напрыклад, Хрыстос, драматычным падзеям, абставінам, калізіям і парадоксам гісторыі. Так і мы, беларусы, у большасці сваёй падобныя на чарвякоў з прытчы Янкі Сіпакова «Наперад, наперад», што ідуць наперад і знішчаюць усё на сваім шляху, бо пры гэтым нічога не трэба рабіць, а «тыя, што ідуць наперадзе, і думаюць і вырашаюць за сябе, за цябе, за ўсіх»[5]. І толькі адзін чарвяк засумняваўся ў справядлівасці падобнага механічнага дзеяння, пачаў думаць, ці туды яны ўсе разам ідуць, і адразу ж з іншымі іншадумцамі-смель-

чакамі, да яго падобнымі, быў раструшчаны, бо «рабы не дазваляюць сабе такой раскошы — думаць, што яны вольныя»[6].

Людзі з прытчы Сіпакова «Дарога» спяшаюцца ў нейкую светлую будучыню, едуць на машынах у рай, ва унісон прамаўляюць: «Хутчэй! Хутчэй! Едзем! Едзем!» І толькі адзін чалавек (той жа чарвяк у новым абліччы) «пацiскаў плячыма — навошта? куды?»[7] Ён, адзіны відушчы ў такіх абставінах, не можа не сумнявацца, чаму дарога вядзе толькі ў адзін бок, чаму людзі едуць без багажу і без рэчаў. А дарога, аказваецца, вядзе ў бездань. Туды падаюць машыны, там гінуць сотні, тысячы людзей. Ды такое адкрыццё цікаўнаму абышлося дорага: ён не толькі зразумеў, «што не заўсёды там рай, дзе нам здаецца, куды мы прагнем і хочам, куды з радасцю спяшаемся»[8], але і дакладна ўсвядоміў, што сам рана ці позна апыніцца ў бездані. Часта мы — толькі пластылінавыя людзі, вылепленыя ўладай для задавальнення яе інтарэсаў, жывем па яе правілах, канонах і законах. Але рана ці позна сярод «невідушчых» пластылінавых людзей знойдзецца ці народзіцца «відушчы» прарок, які вызваліцца з ланцугоў «рухомых», навучыцца бачыць, хадзіць, уладарыць і весці за сабой іншых («Пластылінавыя людзі»). Справа, як нам думаецца, і, магчыма, думаецца самому пісьменніку, заключаецца ў тым, што так званыя уладары часта падпарадкоўваюць значна мацнейшых за сябе. Пры гэтым адбываецца падмена каштоўнасцей: «Слабыя спрадвеку кармілі моцных, а моцныя рабілі выгляд, што толькі дзякуючы менавіта ім жывуць і кормяцца слабыя»[9] («Слабыя і моцныя»).

Мудрацы-прарокі, як заўсёды, у «бязглуздыя дні» аказваюцца не да месца, а прайдзісветы займаюць ганаровыя пасады. Працягваецца гэтая тэма і ў прытчы пісьменніка «Выгнанне дэманаў». Ілжэпрарок, ілжэсвяты, ілжэправадыр часта дзякуючы красамоўю прымушае людзей бачыць толькі тое, у што верыць сам, пераконвае людзей у іх грэшнасці. А на самой справе аказваецца, што не прарокі і святары, а толькі «вернікі часцей за ўсё бываюць святымі»[10]. Біблія дапамагае нам адрозніць прарокаў і ілжэпрарокаў па іх дзейнасці і справах: «Берегитесь лжепророков, которые приходят к вам в овечьей одежде, а внутри суть волки хищные. По плодам их узнаете их. Не может дерево доброе приносить плоды худые, ни дерево худое приносить плоды добрые» (Мф. 12, 19). А ўвогуле бездакорна сумленных і правільных людзей не было і не будзе. Ілжэпрарокі і нячысцікі так удала маскіруюцца пад правадыроў, святых, што толькі вока мудраца, які ведае, што ўсе людзі грэшныя і ён сам не выключэнне з агульнага правіла, знойдзе і выкрые такіх прайдзісветаў.

У прытчападобнай аповесці «Тыя, што ідуць» народ, які выгнаны моцнай тэхнагеннай катастрофай з родных мясцін, шукае

сябе, выконвае кожную ноч свае спрадвечныя заняткі і абавязкі — сее і будуе, каб потым, пасля доўгага блукання, знайшоўшы нешта важнае, нікому невядомае, вярнуцца назад, ідучы ўперад, сабраць плён працы сваёй. «Тыя, што ідуць» — прытча-папярэджанне пра магчымую страту беларусамі Бацькаўшчыны, памяці і гісторыі. Гэты твор працягвае ідэю пошукаў народам сябе, напамінак, што чалавек, нягледзячы на свой востры зрок, падчас не бачыць, куды вядзе яго шлях цывілізацыі, заснаванай на разбурэнні і знішчэнні прыроды і чалавечага ў чалавеку. Прыклад таму — злавесны Чарнобыль, «дзякуючы» якому беларусы хутка апынуцца ў «Чырвонай кнізе». Артыкул жа ў цэлым хочацца закончыць словамі Янкі Сіпакова з яго цыклу мініяцюр «Узятак з маўчання», напісаных пад уплывам вынікаў чарнобыльскай трагедыі: «Што такое жыццё? Гэта адзінства, узаемаразуменне і садружнасць зямлі, вады, паветра і агню. І яшчэ — думкі. Але думка можа і не адбыцца, калі няма папярэдняга ўзаемаразумення. А можа, наадварот, думка якраз і з'яўляецца насуперак такому адзінству і такой садружнасці?»

[1] Купала Янка. Жыве Беларусь: Вершы, артыкулы. Мн., 1993. С. 32.
[2] Тамсама. С. 65.
[3] Тамсама. С. 165.
[4] Тамсама. С. 351—352.
[5] Сіпакоў Я. Тыя, што ідуць: Кн. прытчаў. Мн., 1993. С. 31.
[6] Тамсама. С. 33.
[7] Тамсама. С. 49.
[8] Тамсама. С.52.
[9] Тамсама. С. 95.
[10] Тамсама. С. 85.

*К. С. Карнялюк*

# ВЯЛІКІ ЭПАС XX СТАГОДДЗЯ Ў АДЛЮСТРАВАННІ ЯКУБА КОЛАСА І ЯНКІ КУПАЛЫ

Сваёй творчасцю Янка Купала і Якуб Колас уводзілі беларускую літаратуру ў еўрапейскі культурны кантэкст. І сапраўдны кантэкст, у якім «незвычайнасць» абодвух класікаў можа быць хоць неяк вызначана і спасцігнута, у якім з'явы «Купала» і «Колас» упісваюцца найбольш несупрацьлегла, арганічна і, галоўнае, цалкам, ёсць кантэкст не літаратуры толькі, але і цэласны кантэкст Беларусі як сусветнага феномену, кантэкст нацыянальнага, народнага лёсу, кантэкст «вялікага быцця» (М. Бахцін). У іх творчасці выявіўся ўнутраны зварот да «эпапейнага» мыслення, сутнасць якога ў тым, што чалавек паказаны ў цесным адзінстве з